Добры дзень!

**Сёння на занятках нам неабходна будзе** акцэнтаваць увагу на асноўных патрабаваннях да арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўніка і вучняў; разгледзець асноўныя памылкі ацэньвання; прадэманстраваць некаторыя прыёмы арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці на ўроках.

## МАРШРУТНЫ ЛІСТ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

Прадмет БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЭМА ЗАНЯТКАЎ

**Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы**

На занятках Вам трэба асэнсаваць ролю працэсу ацэньвання ў павышэнні узроўню вучэбнай матывацыі школьнікаў.

**Да канца заняткаў Вы будзеце**

**ведаць** метадычныя асновы кантрольна-ацэначнай дзейнасці,

**умець** працаваць з рознымі відамі інфармацыі па тэме заняткаў, прымяняць атрыманыя веды ў свёй прафесійнай дзейнасці.

Вы будзеце сёння паспяховым, калі на працягу заняткаў зможаце выканаць прапанаваныя інтэрактыўныя практыкаванні, выбраць патрэбную інфармацыю з “воблака слоў”, прааналізаваць прапанаваную інфармацыю, выканаць тэставае заданне на замацаванне атрыманай інфармацыі.

| Крок | Інструкцыя для ўдзельніка |
|---|---|
| 1 | Адным з самых моцных стымулаў да перагляду падыходаў і ўласных пазіцый да эфектыўнага навучання беларускай мове з’яўляюцца кантроль і ацэнка вынікаў навучання. Для настаўніка ацэнка ведаў і ўменняў вучняў з’яўляецца найбольш складанай задачай.<br>Як зрабіць так, каб адзнакі сталі стымулам развіцця мыслення, павышэння актыўнасці і паспяховасці вучняў на ўроку? На гэтае пытанне мы павінны даць адказ у заключнай частцы заняткаў. |
| 2 | I. Перайдзіце па спасылцы, рашыце метадычную задачу. — https://learningapps.org/11306989<br>Адразу паяўляюцца пытанні: *Што ацэньваць? Хто ацэньвае? Як ацэньваць?* І ні ў якім выпадку не трэба блытаць два паняцці – “адзнака” і “ацэнка”.<br>II. Перайдзіце па спысылцы, узнавіце змест. — https://learningapps.org/11307606<br>Перайдзіце па спысылцы, узнавіце змест. — https://learningapps.org/11307820 |

Казачэнка І.Р. настаўнік-метадыст ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія”

III. Да асноўных суб’ектыўных памылак ацэньвання ў школе адносяцца наступныя. Выберыце іх з прапанаванага “воблака слоў”.




IV. Каб пазбегнуць падобных памылак, неабходна разумець, што ў цэнтры навучання тэхналогіі кантрольна-ацэначнай дзейнасці знаходзіцца вучань. Яго пазіцыя ў навучанні не пасіўная, а актыўная, ён знаходзіцца ў аснове вучэбнай дзейнасці. Ацэньванне трэба разглядаць як *сродак кантролю дасягнення вучэбных вынікаў* і як *адзін з педагагічных сродкаў рэалізацыі мэтаў навучання*.

| **Тры асноўныя напрамкі кантрольна-ацэначнай дзейнасці** | | |
|---|---|---|
| Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка | Самакантроль і самаацэнка | Узаемакантроль і ўзаемаацэнка |

Кантроль настаўніка за працэсам і вынікам працы накіраваны як на дзейнасць вучняў, так і на ўласную дзейнасць, а таксама на ўзаемадзеянне вучняў і настаўніка. Паступова настаўнік перадае ў рукі вучня кантрольна-ацэначны “інструментарый”.

| | |
|---|---|
| V. Перайдзіце па спасылцы і праверце сябе на веданне функцый кантролю вучэбнай дзейнасці | https://learningapps.org/11308894 |

VI. Размяркуйце ў правільным парадку этапы кантрольна-ацэначнай дзейнасці.

| | |
|---|---|
| Для гэтага перайдзіце па спасылцы і выканайце інтэрактыўнае практыкаванне. | https://learningapps.org/11309351 |

3 ***Прааналізуем сітуацыю***:

Мы даволі часта назіраем такую сітуацыю на ўроку: настаўнік дае заданне, напрыклад «Разбярыце сказ..» (ці «Напішыце апавяданне», «Пабудуйце схему….» і інш.), а потым праходзіць па радах і агучвае адзнакі.  У выніку, большасць вучняў незадаволеныя сваімі вынікамі, і ніхто не разумее, чаму ў Пятрова «8», а ў Сідарава «4».

Што настаўнік зрабіў не так?________________________________________

(*Запішыце вашы меркаванні*)

Крытэрыі ацэньвання распрацоўваюцца настаўнікам сумесна з вучнямі ці прапануюцца настаўнікам для абмеркавання вучням.
Акрэслім віды кантролю:

| | |
|---|---|
| Перайдзіце па спасылцы і выканайце інтэрактыўнае практыкаванне | https://learningapps.org/11310454 |

4 Вы зможаце пашырыць свае веды, калі прааналізуеце табліцу:
Прыёмы для фарміравання кантрольна-ацэначных здольнасцей вучняў

| Прыёмы папярэдняга кантролю | |
|---|---|
| Мазгавы штурм | Што вы ведаеце па гэтай тэме? |
| Белыя плямы | Што б вы хацелі даведацца па гэтай тэме?<br>Ці зможаце вы выканаць заданне?<br>З якімі цяжкасцямі вы можаце сутыкнуцца?<br>У чым іменна заключаецца цяжкасць? |
| Маршрутны ліст | Састаўце план работы.<br>Якія пытанні неабходна разгледзець?<br>З чаго лепш пачаць і чаму?<br>Што трэба ўзяць з сабой “у дарогу”? |
| Памылкам – не! | На што звярнуць увагу?<br>Якія памылкі я магу дапусціць?<br>Ці патрэбна мне дапамога і якая? |

| Прыёмы бягучага кантролю. Крытэрыі | Балы |
|---|---|
| Даступнасць выкладу | 2 |
| Пісьменнасць | 2 |
| Правільнае маўленне | 2 |
| Поўны аб’ём | 2 |
| Паўната разумення матэрыялу | 2 |

Для замацавання зробленага на сённяшніх занятках выканаем тэст.

| | |
|---|---|
| Перайдзіце па спасылцы.<br>Выканайце тэставае заданне. | https://learningapps.org/11323856 |

5 Пры дапамозе вайбера адпраўце метадысту СМС-паведамленнне, працягнуўшы выразы:
- Я навучыўся …
- На занятках самым складаным было … .
- Сваёй працай на занятках я … , таму што… .

**Дзякуй за працу!**

Казачэнка І.Р. настаўнік-метадыст ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія”